УДК 930(476)

***А.А. Савіч***
*канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі славянскіх народаў*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна*
e-mail: uleks@tut.by

# ПАЛІТЫКА ПОЛЬШЧЫ І СТАНОВІШЧА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1921–1939 гг. У АДЛЮСТРАВАННІ АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ 1920-х – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ 1950-х гг.

*Раскрываецца абумоўленасць акцэнтаў і фармулёвак прэзентацыі адпаведных пытанняў сацыяльна-палітычнымі прыярытэтамі савецкай улады. Выяўляюцца асноўныя тэматычныя сюжэты, іх палітыка-ідэалагічная скіраванасць, дынаміка фармулёвак і акцэнтаў даследаванняў адносна стрыжнёвых аспектаў тэмы. Прадстаўлена айчынная гістарыяграфічная канцэпцыя палітыкі Польшчы ў Заходняй Беларусі. Апублікаваныя працы акцэнтавалі ўвагу на акупацыйнай, захопніцкай сутнасці польскай улады, стварэнні Польшчай жорсткага рэжыму абмежаванняў і праследаў у дачыненні да мясцовага няпольскага насельніцтва, скіраванага на асіміляцыю і паланізацыю Заходняй Беларусі, і адрозніваліся высокім ідэйна-палітычным і эмацыйным узроўнем з bідавочнай арыентацыяй на неабходнасць арганізацыі рэвалюцыйнай барацьбы. Першапачатковая наяўнасць аб'ектыўных звестак пра становічыя з'явы заходнебеларускай рэчаіснасці паступова змянілася спрошчанай, тэндэнцыйнай, схематычнай падачай падзей на фоне агульнага негатыўнага стаўлення да польскай улады.*

## Уводзіны

Становішча Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. у складзе Польшчы і палітыка польскіх уладаў у дачыненні да «крэсаў» заўсёды былі адным з прыярытэтных напрамкаў айчыннай гістарычнай навукі. Вывучэнне гісторыі Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы было абумоўлена ў 1920–1930-я гг. дзяржаўна-палітычнымі і сацыяльна-эканамічнымі прыярытэтамі савецкай улады. Відавочнай падставай для актыўнага фарміравання ў тагачасным айчынным ідэйна-палітычным трэндзе адмоўнага вобраза «белапанскай Польшчы» як захопніцы і ворага рабочых і сялян сталі нядобразычлівыя і гвалтоўныя дзеянні польскіх уладаў па ўсталяванні свайго панавання на беларускіх абшарах як у час польска-савецкай вайны, так і пасля Рыжскага міру. Айчынная гістарыяграфія 20–50-х гг. XX ст. сфарміравала вялікі пласт публіцыстычнай і навукова-папулярнай літаратуры, дэтэрмінаванай сацыяльна-класавымі, палітыка-эканамічнымі патрэбамі савецкага кіраўніцтва. Мэтай артыкула з'яўляецца выяўленне ідэйна-палітычных прыярытэтаў айчыннай гістарычнай навукі 1920-х – першай паловы 1950-х гг. і стварэнне гістарыяграфічнай канцэпцыі палітыкі міжваеннай Польшчы і становішча Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.

## Ідэйна-палітычная скіраванасць і змест айчыннай гістарыяграфіі палітыкі Польшчы і стану Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.

Ажыццёўленыя ў савецкай краіне сацыялістычныя пераўтварэнні, рэзка негатыўна ўспрынятыя афіцыйнымі дзяржаўнымі коламі Польшчы, сарваныя летам 1920 г. польскім супрацівам прэтэнзіі бальшавіцка-камінтэрнаўскага кіраўніцтва на распаўсюджванне сусветнай рэвалюцыі, пазіцыянавалі Польшчу як аднаго з галоўных ворагаў Савецкай Расіі, СССР і БССР. Негатыўныя фармулёўкі ў дачыненні да польскай улады ўзмацняліся і дзякуючы актыўнай антыакупацыйнай рыторыцы, якая сыходзіла і ад нацыянальна арыентаваных беларускіх дзеячаў, якія ў адстойванні беларускіх нацыянальна-дзяржаўных прыярытэтаў БНР ажыццяўлялі сярод мясцовага насельніцтва агітацыйна-прапагандысцкія мерапрыемствы, арганізацыйна-падрыхтоўчыя дзеянні паўстанцкага характару, паралельна з гэтым актуалізуючы беларускую праблематыку дыплама-

тычнымі сродкамі на міжнароднай арэне. У выніку гэтага ў пачатку 1920-х гг. паступова гістарыяграфічна складваўся надзвычай негатыўны вобраз Польшчы і яе палітыкі ў Заходняй Беларусі, які павінен быў кансалідаваць насельніцтва па абодва бакі рыжскай мяжы на падставе ідэалогіі і практычных мерапрыемстваў антыакупацыйнай нацыянальна-вызваленчай барацьбы. Аўтарытэтным пачынальнікам такой гістарыяграфічнай традыцыі стаў А. Луцкевіч, які ў сваёй вядомай працы прадставіў вобраз захопніцкай Польшчы, пацвярджаючы адпаведныя тэзісы яркімі і красамоўнымі прыкладамі злоўжыванняў прадстаўнікоў польскай ваеннай і цывільнай адміністрацыі на захопленых землях Беларусі [1]. Пры гэтым неабходна адзначыць памяркоўнае стаўленне да мерапрыемстваў польскай улады з боку нацыянальна арыентаваных беларускіх колаў Заходняй Беларусі, якія, нягледзячы на навязванне палякамі сваіх парадкаў, разлічвалі на наладжванне партнёрскіх узаемаадносін з польскай уладай, пры гэтым неадназначна ацэньваючы яе практычныя дзеянні [2–4]. Відавочна паланафільскія погляды дэманстравала газета «Еднасць», якая заклікала беларусаў да кансалідацыі і легальнай актыўнай грамадскай справы, у тым ліку ўдзелу ў выбарах у польскі сейм, зыходзячы з таго, што «будучы Сойм, які выбірае гэты народ у сваёй большасці – безумоўна выявіць волю і жаданні не паноў і іх хаўруснікаў, а сялянскага і рабочага люду, з якім ідзе і ўся дэмакратыя Польшчы» [5]. Адназначна адмоўную пазіцыю ў дачыненні да Польшчы дэманстравалі эсэраўскія дзеячы, якія выступалі за ўмацаванне беларуска-літоўскіх дзяржаўна-палітычных сувязей, у прыватнасці К. Дуж-Душэўскі, вядомы беларускі палітык, у 1920-я гг. – супрацоўнік міністэрстваў беларускіх і замежных спраў Літвы [6].

Сваёй танальнасцю адназначна фарміравалі ўяўленне пра Польшчу як ворага беларускага народа, рабоча-сялянскай улады, БССР і СССР перыядычныя выданні БССР. Вядома, што пасля няўдалага паходу на Варшаву і заключэння Рыжскай дамовы вырашэнне лёсу Заходняй Беларусі звязвалася з развіццём класавай, рэвалюцыйнай нацыянальна-вызваленчай барацьбы, ідэі сусветнай рэвалюцыі. Ідучы па шляху рэалізацыі гэтых планаў, савецкае кіраўніцтва актыўна праводзіла працу па інспірацыі і падтрымцы антыпольскіх настрояў у Заходняй Беларусі. Найважнейшымі ў гэтым сэнсе былі дзеянні па выкрыванні ў перыядычным друку рознага кшталту мерапрыемстваў польскіх уладаў у Заходняй Беларусі, тым больш што палітыка Польшчы ў дачыненні да беларусаў на «крэсах» была ў канчатковым выніку скіравана на іх паланізацыю. Таму ўжо ў пачатку 1920-х г. у перыядычным друку БССР з'явіліся артыкулы, прысвечаныя заходнебеларускай праблематыцы [7, с. 22]. Публіцыстыка ўздымала пытанні знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы, даючы адназначна адмоўную ацэнку палітыка-прававому, сацыяльна-эканамічнаму і сацыяльна-культурнаму становішчу, якое складвалася ў той час на «крэсах» у выніку акупацыйна-захопніцкай, асімілятарскай палітыкі Польшчы. Публікацыі ў перыядычным друку павінны былі садзейнічаць уздыму рэвалюцыйнага руху ў краі, аказаць маральна-палітычную падтрымку яго ўдзельнікам у змаганні з польскім рэжымам. Такога кшталту матэрыялы, выяўляючы савецкія партыйна-дзяржаўныя пазіцыі ў дачыненні да знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы, сталі нормай айчыннага публіцыстычна-прапагандысцкага стылю [8–11].

З сярэдзіны 1920-х гг. у фарміраванні інфармацыйнага поля заходнебеларускай рэчаіснасці гісторыка-публіцыстычныя матэрыялы дапаўняюцца больш значнымі публікацыямі ў выглядзе кніг, зборнікаў артыкулаў і дакументаў, якія выдзяляюцца сваёй красамоўнасцю і канцэптуалізацыяй заходнебеларускай тэматыкі на падставе антыпольскай антыакупацыйнай рыторыкі [12–17]. Асаблівасцю некаторых матэрыялаў з'яўляецца спроба філасофскага асэнсавання становішча беларусаў у Польшчы, стану і задач нацыянальнага адраджэння беларускага народу на фоне рэалізацыі захопніцка-інтэграцыйных дзяржаўна-палітычных праектаў Польшчы, польскай палітыкі ў Заходняй Беларусі і яе наступстваў. У прыватнасці, такой адметнасцю вызначаюцца артыку-

лы з віленскага зборніка «Заходняя Беларусь», матэрыялы якога былі падрыхтаваны ў 1923–1924 гг. Заходнебеларускія аўтары, апрача крытыкі ў дачыненні да польскай палітыкі, якая «пагражае самаму істнаваньню беларускай нацыянальнасьці» (А. Луцкевіч), дэманстравалі аптымізм і надзею на канструктыўнае супрацоўніцтва з польскім грамадствам, нягледзячы на дэструктыўныя дзеянні польскай улады. На фоне адсутнасці грамадскай кансалідацыі беларусаў адносна абароны каштоўнасцей нацыянальна-культурнага і грамадскага характару яны заклікалі да калектыўнай самаахвярнасці (І. Канчэўскі), на фоне «паваеннай барбарызацыі эўрапейскага грамадзянства, гэткую сільную і ў Польшчы», заклікалі да адстойвання «беларускага духу» ва ўмовах рэальнай перспектывы поўнай асіміляцыі беларусаў і іх «дэнацыяналізацыі» У. Самойла (Суліма) [12, с. 5, 8, 67, 68].

Негатыўным стаўленнем да польскай улады і перакананнем у неабходнасці рашучай барацьбы з польскай акупацыяй выдзяляліся выданні БССР. Краевугольным каменем афіцыйнай савецкай ідэалогіі і гістарыяграфіі ў дачыненні да адлюстравання гісторыі Заходняй Беларусі быў тэзіс аб Польшчы як аб класава варожай дзяржаве, якая абараняе інтарэсы памешчыкаў і капіталістаў, садзейнічаючы абнішчэнню мясцовага насельніцтва і заняпаду заходнебеларускай эканомікі [14, с. 38; 17, с. 27; 18, с. 43]. Пры гэтым нацыянальны ўціск для забеспячэння паланізацыі і асіміляцыі заходнебеларускага насельніцтва падаваўся як асноўная прыкмета польскай улады. Мэтам канчатковага замацавання Заходняй Беларусі за Польшчаю, пазбаўлення «крэсавых абшараў іх нацыянальнага твару» служыла гвалтоўная палітыка польскай улады па насаджэнні польскай мовы і польскай культуры праз адміністрацыю, суд, школу, касцёл, войска, чыгунку, пошту і г.д. Абапіраючыся на створаныя пры падтрымцы заходніх краін узброеныя сілы, на падставе розных ваенных саюзаў Польшча імкнецца забяспечыць «утрыманьне Крэсаў», перапаўняючы іх войскам, паліцыяй, адміністрацыяй, «зьверскім задушэньнем усякіх адзнак нездавольства і бунту, каб забіць нават самую волю крэсавага жыхарства, перарабіць яго ў пакорлівую масу, сьлепа-паслушную ўсім загадам з Варшавы» [19, с. 16]. М. Лучанін акрэслівае чатыры сферы дзяржаўна-палітычнага рэжыму, якія найбольш відавочна дэманструюць акупацыйна-захопніцкую, асіміляцыйную сутнасць Польшчы. Як крыніцы рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі аўтар вылучае нацыянальную, сацыяльную, палітычную і рэлігійную. Пры гэтым Лучанін не называе ў якасці праблемных сацыяльна-эканамічныя пытанні, хаця ў пераліку «польскіх каменьняў» на першае месца ім пастаўлена зямельная справа, за ёй асадніцтва і потым «школа, газэты, адміністрацыя, паліцыя, шпікі, жандармэрыя, войска, самаўрады, коопэрацыя, падаткі, экономічны крызіс, безрабоцьце, рэлігійны ўціск і г.д.» [14, с. 24].

Крывадушнасць і вераломства польскіх правячых колаў аўтары пацвярджалі ігнараваннем міжнародных абавязкаў Польшчы па забеспячэнні нацыянальна-культурных праў этнічных меншасцей. Публікацыі справядліва звярталі ўвагу на тое, што Польшча прыкрывалася гучнымі лозунгамі і дэмакратычнымі законамі, якія маскіравалі свавольства буржуазна-памешчыцкай улады, злачыннасць і незаконнасць захопу Польшчай заходнебеларускіх зямель і насаджэнне жорскага акупацыйнага рэжыму [14, с. 38; 17, с. 10–11].

Звяртаючы ўвагу на роўныя правы для ўсіх рэлігій паводле польскай канстытуцыі, аўтары актуалізавалі пытанне канфесійнай палітыкі Польшчы, мэтанакіравана павялічвалі яе нядобразычлівыя намеры ў дачыненні да праваслаўнай царквы і ўвогуле да беларускага народа, адназначна выстаўляючы каталіцызм як сродак асіміляцыі і паланізацыі краю. Акцэнтацыя на абмежаванні ў дачыненні да праваслаўя і праваслаўных, закрыцці цэркваў, шматлікія мерапрыемствы рэвіндыкацыі павінны былі ўзмацніць негатыўнае стаўленне праваслаўнага насельніцтва да польскай улады і каталіцкай царквы як праваднікоў і выканаўцаў асіміляцыйнай польскай палітыкі. Пры гэтым

з агульнага праваслаўнага асяродка выдзяляліся праціўнікі польска-каталіцкай улады і яе прыхільнікі. Да здраднікаў інтарэсаў народа аднесены і вышэйшыя праваслаўныя іерархі, «пастаўленыя на адпаведныя пасады польскімі чыноўнікамі», таму аўтарытэт «іх зусім слабы», а праваслаўныя беларусы не хочуць прызнаваць за сваіх і «проста прагналі-б іх вон, як наймітаў польскага ўраду, каб маглі гэта зрабіць» [14, с. 40–41]. «Праваслаўная царква стала фактарам спольшчваньня, яна ў асобах сваіх вышэйшых іерархаў узамен на матар'яльны добрабыт ахвотна йдзе насустрач плянам польскага ўраду» [19, с. 16].

Нядобразычлівае стаўленне да беларусаў аўтары пацвярджалі і абмежаваннямі ў школьным пытанні: польскія ўлады ўсяляк намагаліся прыпыніць працу па стварэнні беларускай пачатковай школы, разбурыць створаную раней сетку беларускіх навучальных устаноў. Так, адзін з заснавальнікаў Таварыства беларускай школы (ТБШ) А. Смоліч небеспадстаўна сцвярджаў: «Школ беларускіх на вёсцы няма; апошнія дзесятак вясковых школ, які застаўся ад больш лібэральных часоў, пакрысе ліквідуецца» [20, с. 37]. У некаторых выпадках паказаны і канструктыўныя дзеянні ўладных структур па стабілізацыі становішча на «крэсах», абвостранага ў выніку актывізацыі партызанскага руху, шляхам распрацоўкі, прыняцця і ажыццяўлення «моўных законаў» [19, с. 19, 20, 25]. Аднак агульная скіраванасць польскіх уладаў на скасаванне беларускага школьніцтва была відавочнай і дэструктыўнай. Дастаткова аб'ектыўнымі былі заявы, што ў польскія школы «селянін сваіх дзяцей пасылаць ня хоча; там вучыць яго вораг, урадовец, які да сялянства адносіцца не лепш паліцыянта; навука там ня навука, але агітацыя за ненавісную Польшчу» [20, с. 37].

Справядлівага асуджэння заслугоўвала і пададзеная як каланіяльная эканамічная палітыка Польшчы, у тым ліку ў галіне прамысловасці, развіццё якой, паводле айчынных аўтараў, усялякімі сродкамі стрымлівалі і мэтанакіравана падрывалі [21, с. X]. Але ў першую чаргу аграрная сфера, з улікам падаўляльнай колькасці сялян у структуры насельніцтва Заходняй Беларусі, мела палітычнае значэнне і прыцягвала значную ўвагу айчынных аўтараў як сродак паланізацыі мясцовага насельніцтва. Асабліва гэта тычыцца асадніцтва, якое, як адзначалася, служыла «падвойным мэтам: беспасрэдна ваенным і палёнізатарскім» [19, с. 16]. Пры гэтым з пункту гледжання эканамічнай неабходнасці выказвалася паразуменне з польскім урадам, які, жадаючы выраўняць гушчыню насельніцтва ў розных частках дзяржавы, прыступіў да каланізацыі «ўсходніх крэсаў» выхадцамі з цэнтральнай Польшчы. «Асаднікі» на старонках выданняў заканамерна атрымалі статус праваднікоў эканамічнай, нацыянальнай, культурнай палітыкі польскага ўраду, здольныя на выкананне любых спраў, накіраваных на ўмацаванне польскага панавання, у тым ліку выканання ваенна-паліцэйскіх функцый [14, с. 24, 25; 19, с. 17; 20, с. 38, 39; 22, с. 45, 47, 54]. Справядліва адзначалася шкода польскай справе «на крэсах» ад асаднікаў, таму што асадніцтва «адпіхнула» беларускае сялянства ад «панскай культуры» і ўзмацняла беларускі рэвалюцыйны рух [14, с. 25].

На гэтым фоне актыўна выкарыстоўваліся відавочныя недахопы мясцовага самакіравання як сродку ўсталявання польскага панавання. Выбары і функцыянаванне мясцовага самакіравання павінны былі забяспечыць функцыянаванне нізавых органаў, садзейнічаць паўнавартаснаму вырашэнню бягучых адміністратыўна-гаспадарчых і сацыяльна-культурных патрэб, уцягваць мясцовае насельніцтва ў легальны палітычны працэс. Савецкія аўтары дастаткова аб'ектыўна ілюстравалі недахопы «самаўрадаў». Катэгарычнасць аўтараў не пакідала сумнення ў чарговым акце непавагі да сваіх жа законаў і заходнебеларускага насельніцтва з боку польскага ўрада, які, жадаючы хутчэй «польшчыць край», запоўніў яго «хмарамі чыноўніцтва, камплектуемага з ураджэнцаў карэннай Польшчы», мясцовым жа, няпольскім элементам ніякага ходу няма [19, с. 18]. Карыстаючыся шырокай палітрай мастацкіх сродкаў, аўтары красамоўна пераконвалі:

«І павятовыя і гмінныя “самаўрады” Заходняй Беларусі – толькі адна назва. Выбраны яны старастаю, а не насяленьнем, і выяўляюць яны волю старасты, а не насяленьня, і, значыцца, яны зьяўляюцца не грамадзянскаю, а ўрадоваю ўстановай, дапамагаючы абшарніцка-ксяндзоўскай Польшчы змагацца з беларускім сялянствам». «У гмінных і павятовых самаўрадах сядзяць цяпер “паны, падпанкі, шэршні, мяшчане, ксяндзы”, але няма там “нашага” селяніна» [14, с. 36]. Свавольства ў справе правядзення выбараў і падпарадкаванне органаў самакіравання ваяводам і старастам выкрывалі Б. Вансоўскі і Г. Рудаміно [17, с. 13 ]. Паводле А. Смоліча, польская адміністратыўная сістэма ў Заходняй Беларусі, дзе «адноўлены сярэднявечныя пыткі», акрамя наяўнасці «самых нялюдзкіх зьдзекаў і зьверстваў польскага паліцыянта, урадоўца і жаўнера», характарызавалася адсутнасцю прадэклараванага нарматыўна-прававымі актамі фактычнага мясцовага самакіравання, «нават у такім скромным разьмеры, як іх тут дапускала царская Расія. Нават у воласьці-гміне сядзіць не выбраны сялянамі старшыня, а назначаны войт – у лепшым выпадку мясцовы падпанак, а ў большасці – прыезджыя палякі, часта з цёмнай біяграфіяй… Кіруе паветам самаўладца – стараста… Хабарніцтва, ашуканства бяскарна пануюць у “крэсовай” гміне» [20, с. 37–38].

Высокі ўзровень грамадскай эмацыйнасці суправаджаў падачу негатыўнага вобраза польскага судаводства як лагічнага завяршэння і сімвала польскага несправядлівага і злачыннага панавання. Аўтары падкрэслівалі варожую сацыяльна-класавую сутнасць польскай буржуазна-памешчыцкай сістэмы. Асобнае месца ў выкрыванні судовай улады займалі згадкі пра ваенна-палявыя суды, уведзеныя ў Заходняй Беларусі пасля актывізацыі паўстанцка-партызанскіх дзеянняў: «Тут выносяць прыгывара аб сьмерці толькі па адным падазрэньні, бяз усякіх рэчавых доказаў віны… Ніколі ня могуць злавіць сапраўднага вінавайцу, а накідваюцца на западазронага і цягнуць яго пад суд, які і выносіць прыгавор аб сьмерці» [14, с. 43–44]. Адзначаючы зацікаўленасць айчынных савецкіх аўтараў у іх патрыятычным жаданні забяспечыць вобраз несправядлівага польскага панавання, заўважым, што такога кшталту развaжанні ігнаруюць шырока вядомыя прыклады вынясення справядлівых і нават апраўдальных прысудаў у дачыненні да апанентаў польскай улады, у тым ліку западозраных у партызанскай дзейнасці [23, с. 58–59].

Своеасаблівай энцыклапедыяй злоўжыванняў польскай улады розных узроўняў па справядлівасці лічыцца зборнік «Інтэрпэляцыі беларускіх паслоў у польскі сойм». Дастаткова інфарматыўным і красамоўным з’яўляецца «Паказьнік характару інтэрпэляцый, зьмешчаных у зборніку, і іх месца», у якім па рубрыках прадстаўлены асобныя накірункі і праявы злачынстваў прадстаўнікоў польскай улады. Сярод іх «Прасьледаваньні ў галіне народнае асьветы і школы», «Прасьледаваньні беларускае прэсы», «Гвалтоўная аграрная палітыка», «Адміністрацыйныя напраўнасьці і прасьледваньні», «Масавыя бяспраўныя арышты, катаваньні і зьдзекі», «Зьдзекі жаўнераў над насельніцтвам», «Зьдзекі і біцьцё дзяцей-вучняў» і інш. [16, с. III–IV]. Але адзначым, што сама працэдура, якая дазваляла сабраць і прапанаваць ўвазе вышэйшай заканадаўча-прадстаўнічым уладам Польшчы выкрывальныя і скандальныя прыклады злачынстваў, безумоўна, пацвярджала наяўнасць у краіне дэмакратычных механізмаў, што не прываблівала савецкіх ідэолагаў.

Гэта трэба аднесці і на карысць іншых выданняў, якія рэзка выкрывальна пазіцыянавалі Польшчу ў другой палове 1920-х гг., але на фоне згортвання беларусізацыі і дэмакратычных тэндэнцый грамадска-палітычнага жыцця і, наадварот, нарастання аўтарытарна-таталітарных прыкмет жыцця ў БССР, актыўнай інспірацыі беларускага нацыянальнага дэмакратызму, на фоне індустрыялізацыі і калектывізацыі паказвалі станоўчыя аспекты гісторыі Польшчы. У першую чаргу, гэта парадаксальна тычыцца выданняў, якія яскрава і шматпланава ілюстравалі падзеі, звязаныя з забаронай Грамады [24–27]. У гэтым шэрагу сваім высокім публіцыстычным стылем з элементамі навуко-

вага падыходу выдзяляецца выданне 1929 г. пад красамоўнай назвай «Западная Белоруссия на скамье подсудимых» [27]. У ім разам з раней шматразова агучанымі тэзісамі пра вядомыя і прызнаныя заганы польскай палітыкі праілюстраваны высокі ўзровень і спеласць судовай сістэмы Польшчы, што відавочна дысаніравала з савецкай судовай практыкай, антыгуманная і неправавая сутнасць якой паглыбілася яшчэ больш у 1930-я гг. [27, с. 4]. Выданне акцэнтуе ўвагу на нацыянальным уціску польскай улады ў дачыненні да беларускага насельніцтва, але змяшчае інфармацыю пра насычанае сацыяльна-культурнае жыццё; прыведзены варыянты інтэграцыі заходнебеларускіх зямель, падкрэслена нязручная для савецкага кіраўніцтва легальнасць Грамады, нягледзячы на яе рэвалюцыйны імпэт і рабоча-сялянскі характар, якія не сталі перашкодай для афіцыйнага прызнання польскай уладай і наступнага яе функцыянавання як магутнага, апазіцыйнага ўраду прадстаўніка беларускага народа [27, с. 37, 39, 41, 42]. Відавочна, што ва ўмовах барацьбы за сацыялізм сітуацыя такога кшталту была недапушчальнай.

БСРГ і яе адлюстраванне яе дзейнасці на старонках розных выданняў былі своеасаблівым маркерам, які выяўляў сапраўдныя адносіны заказчыкаў і выканаўцаў да заходнебеларускай праблематыкі. Згадванне Грамады як легальнай арганізацыі рэвалюцыйнага характару, якая ўзнікла ў выніку функцыянавання дэмакратычных працэдураў у Польшчы, абвяргаў аднабаковыя, тэндэнцыйныя і неаб'ектыўныя публіцыстычныя штампы пра «крывавы польскі рэжым», «удушэнне беларускіх рабочых і сялян» і інш. Таму кіраўнікам савецкіх ідэалагічна-прапагандысцкіх інстанцый, напэўна, было вельмі няёмка ад самога факту існавання Грамады і яе ідэалагічнай спадчыны. Нядзіўна, што ў другой палове 1930-х гг. у літаратуры з'явіўся зручны для савецкіх ідэолагаў тэзіс аб Грамадзе як дыверсіі пілсудчыкаў, створанай «польскім рэжымам» [7, с. 42].

У разгледзеных публікацыях на фоне беларусізацыі ў БССР яскрава выяўляецца імкненне аўтараў «беларусізаваць» заходнебеларускую сітуацыю, ігнаруючы наяўнасць і значэнне ў жыцці Заходняй Беларусі прадстаўнікоў іншых народаў, у першую чаргу яўрэяў, якія складалі вялікі адсотак гарадскога і мястэчковага насельніцтва. Такі «беларусацэнтрызм» быў характэрны, у прыватнасці, для прац А. Смоліча і М. Лучаніна, якія ў сваіх дзяржаўна-палітычных і нацыянальна-культурных памкненнях зыходзілі з прыярытэтаў беларускага сялянства як вызначальнай большасці насельніцтва Заходняй Беларусі [14; 20]. Гэта выклікала незадаволенасць «небеларускіх» грамадска-палітычных дзеячаў Заходняй Беларусі і БССР, у тым ліку прапольскіх колаў. Магчыма, вынікам вядомай ідэйна-палітычнай канкурэнцыі ў камуністычным руху Заходняй Беларусі [28] як праявы некаторага ідэйна-палітычнага плюралізму ў гістарыяграфічнай сітуацыі сярэдзіны 1920-х гг. стала прэзентацыя і многіх станоўчых бакоў «польскага панавання». Разам з адзначанымі вышэй гэта адносіцца і да інфармацыі аб выбарах 1922 г., калі беларусам удалося «здзейсьніць сваё права… пры выбарах у Сойм, калі сам польскі ўрад быў зацікаўлены ў тым, каб насяленьне далучаных краін прымала ўдзел у выбарах, гэтым нібы згаджаючыся на сваё далучэньне да Польшчы» [20, с. 38]; звестак пра гарадскія і валасныя органы самакіравання, якія «маюць пэўныя правы й абавязкі ды сваю выбарную адміністрацыю, праз якую могуць рабіць уплыў на выкананне сваіх пастаноў у галіне самакіравання», і «абцяжараны ўскладзенымі на іх дзяржаўнымі абавязкамі» [17, с. 13]. Сюды можна аднесці і некаторых эканамічныя мерапрыемствы, у тым ліку рэформы ўрада С. Грабскага, які «апраўдаў узложаныя на яго спадзеі, спыніўшы спадак маркі і ўвёўшы сталую валюту. Гэтая ўдача Грабскага ў значнай меры прычынілася да новых ілюзій сярод пралетарыяту і сялянства, новых надзей на паляпшэньне іх жыцьця» [18, с. 46]. Праявай ідэйна-навуковага плюралізму неабходна лічыць і інфармацыю беларускіх выданняў пра кааператыўны рух у Заходняй Беларусі, які з'яўляўся вынікам аб'яднання інтэлектуальных і гаспадарча-эканамічных рэсурсаў беларускага насельніцтва і нацыянальна-вызваленчага руху. Ва ўмовах наяўнасці беларускай каапе-

рацыі як самастойнага чынніка эканамічнага і сацыяльна-палітычнага жыцця адпаведная праблематыка атрымала сваё істотнае вывучэнне пры аналізе вызначальных агульнатэарэтычных, арганізацыйна-структурных, гаспадарчых, фінансавых і асветніцкіх аспектаў кааператыўнага руху [14, с. 37–38; 29].

У пачатку 1930-х гг. прапагандысцкія памкненні савецкага друку былі накіраваны на максімальнае павелічэнне адчування жаху і роспачы ад дзеянняў польскай улады ў Заходняй Беларусі. У сваім антыпольскім запале іх аўтары вельмі часта дэманстравалі высокую ступень эмацыйнасці на падставе гіпербалізацыі і дэманізацыі фактаў нядобразычлівага стаўлення польскіх урадоўцаў да беларускага насельніцтва; шырока выкарыстоўваліся яркія мастацкія прыёмы і звароты: «крывавыя пагромы», «тысячы растрэляных рэвалюцыянераў», «ператварэнне фашысцкіх казэматаў у “фабрыкі сьмерці”», «польскі фашызм залівае агнём і крывёю заходнебеларускія прасторы» [11]. Гісторыкі «творча» асэнсавалі і на прыкладзе заходнебеларускіх грамадска-палітычных падзей ілюстравалі сталінскі тэзіс аб паглыбленні класавых супярэчнасцей і рэалізацыі тэорыі «сацыял- і нацыянал-фашызму», акцэнтуючы ўвагу на тым, як на фоне «нябачных ганенняў і рэпрэсій польскага ўраду» нацдэмы Заходняй Беларусі яшчэ больш дыскрэдытуюць сябе ў вачах народа супрацоўніцтвам з польскім «фашыстоўскім» урадам, а «Астроўскі, Луцкевіч, Акінчыц і Ко – натхніцелі ўсіх жахаў і гвалтаў польскай апрычыны на Зах. Беларусі» [30; 31].

Яшчэ ў 1920-я гг. савецкія публікацыі змяшчалі інфармацыю пра імперскую, захопніцкую сутнасць Польшчы, якая, створаная краінамі Антанты як санітарны кардон, у планах сваіх мае пашырэнне тэрыторыі на ўсходзе і рыхтуецца да контррэвалюцыйнай вайны з СССР [17, с. 78; 18, с. 43]. Але больш яскравыя выявы атрымаў дадзены гістарыяграфічны дыскурс у пачатку 1930-х гг., калі на тэрыторыі Заходняй Беларусі заўважаецца актыўнасць рэвалюцыйных элементаў і інспірацыя «народных паўстанняў» з надзеяй на дапамогу ад СССР, актуалізуюцца думкі аб агрэсіўных намерах Польшчы ў дачыненні да Савецкай краіны, усё часцей згадваецца Польшча як плацдарм нападзення на СССР [32]. Своеасаблівым узорам антыпольскай рыторыкі і пафаснай падачы стану «на крэсах» з’явілася выданне «Краіна шыбеніц і карных экспедыцый»: «Польскі капіталістычна-абшарніцкі, фашысцкі ўрад пры дапамозе соцыял- і нацыянал-фашыстаў розных колераў, рыхтуючыся да контррэвалюцыйнай вайны супроць Савецкага Саюзу, самым жорсткім чынам распраўляецца з рэвалюцыйнымі выступленнямі рабочых і сялян, душыць малейшыя праявы нацыянальна-вызваленчага руху шырокіх працоўных мас прыгнечаных народаў» [33, с. 3]. Аднак і гэтаму выданню не ўдалося «пазбавіцца» звестак пра адносна мяккія ўмовы ўтрымання ў польскіх турмах, пра іх кантроль з боку польскіх вышэйшых дзяржаўных і парламенцкіх улад, магчымасць выдання турэмных газет, барацьбу з турэмным рэгламентам і інш. [33, с. 6–11, 49–50, 53]. Нават простае прымяненне гісторыка-параўнальнага метаду дазваляе суаднесці ўмовы турэмнага зняволення ў СССР і Польшчы не на карысць савецкага боку.

**Заключэнне**

Вядома, што сталінскае кіраўніцтва ў канцы 1920-х гг. на фоне развіцця сусветнага эканамічнага крызісу пачало актывізацыю рэвалюцыйнага руху ў Польшчы. З гэтага часу ва ўмовах нарастання і ўмацавання аўтарытарных тэндэнцый у савецкім дзяржаўна-палітычным кіраўніцтве адбываўся рост рэвалюцыйнай рыторыкі, і згаданы вышэй плюралізм пачаў мэтанакіравана абмяжоўвацца ў накірунку да ўсталявання адзінага ўніфікаванага вобразу Польшчы і Заходняй Беларусі ў яе складзе. У першую чаргу для гэтага неабходна было пазбавіцца фактаграфічных дэталяў, якія «размывалі» патрэбны негатыўны вобраз Польшчы. Гэта вяло да дэградацыі заходнебеларускай гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі, схематызацыі і прымітывізацыі публікацый, іх

відавочнай тэндэнцыйнасці і заідэалагізаванасці. І калі публікацыі 1920-х гг. заўважна дэманстравалі імкненне да аб'ектыўнасці, то ў 1930-я гг. стаўленне савецкіх аўтараў да Польшчы і яе дзяржаўнасці было яскрава накіравана на іх спрашчэнне і прымітывізацыю, што відавочна не адпавядала рэчаіснасці і прыводзіла да вульгарызацыі гісторыі Заходняй Беларусі.

На адпаведнае «ачышчэнне» ад непажаданай фактаграфіі паўплывала пагаршэнне арганізацыйна-навуковых умоў пачатку 1930-х гг., звязанае з рэпрэсіямі ў дачыненні да беларускіх, а потым і польскіх грамадска-палітычных дзеячаў і навуковых кадраў у БССР і СССР і як своеасаблівы канчатковы дэкор гістарыяграфічнай сітуацыі – роспуск КПП і КПЗБ і ўз'яднанне беларускіх зямель [7, с. 41–42]. У выніку сфарміравалася версія стану Заходняй Беларусі ў складзе міжваеннай Польшчы, аснову якой складалі тэзісы, агучаныя ў пострэраснёўскіх публікацыях 1939–1940 гг. Знакаміты выраз Молатава аб Польшчы як «уродливом детище Версальского договора, жившего за счет угнетения непольских национальностей» [34, с. 7] не даваў шанцаў гісторыкам аб'ектыўна адлюстроўваць гісторыю Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы.

Заўважнае павышэнне градуса «злачынстваў польскай улады» павінна было ў чарговы раз падкрэсліць справядлівасць кампаніі верасня 1939 г. і вызвалення «адзінакроўных братоў». На гэта былі накіраваны як агітацыйныя матэрыялы для савецкіх работнікаў [35–38], так і больш значныя выданні [35], дзе рэзка асуджалася польская ўлада, гіпербалізаваліся памеры і ўзровень яе недахопаў. Усё гэта не павінна было пакінуць чытача раўнадушным да маркотнага мінулага «за панскай Польшчай» на фоне светлых надзей на паляпшэнне жыцця ў сацыялістычнай Радзіме. Мэтанакіраваная і свядомая драпежная каланіяльная палітыка, заняпад прамысловасці, малазямелле і панаванне буйнога памешчыцкага землеўладання, антынародная сутнасць аграрных рэформаў, наяўнасць вялікай колькасці натуральных павіннасцей, адпрацовак, невыносных і здзеклівых штрафаў і пабораў у канцэпцыі І. Лочмеля выяўлялі базіс створанай у Заходняй Беларусі «польскай буржуазна-памешчыцкай каланіяльнай сістэмы акупацыйнага панавання, дзікага нацыянальнага прыгнёту, жорсткага пераследу беларускай культуры, гвалтоўнай асіміляцыі і паланізацыі» [39, с. 117–125]. Такога кшталту надзвычай тэндэнцыйнае, аднабаковае, спрошчанае асвятленне дзяржаўна-палітычнага стану Заходняй Беларусі ў складзе польскай дзяржавы стала прыкметай і пасляваенных выданняў, якія да другой паловы 1950-х гг. тыражыравалі вышэйадзначаныя тэзісы, забяспечваючы іх рысамі савецкага акадэмізму сталінскага перыяду [40–44].

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Луцкевіч, А. Польская акупацыя Беларусі / А. Луцкевіч. – Мінск : Адраджэнне, 1992. – 19 с.
2. Што за палітыка? // Беларус. ведамасьці. – 1921. – 3 кастр.
3. Дзед Кузьма. Беларусы, бярыцеся за грамадзкую работу / Дзед Кузьма // Беларус. ведамасьці. – 1921. – 3 кастр.
4. Chłopčyk s pad Hrodny. Naša baćkauščyna – Biełaruś // Krynica. – 1921. – 23 stud.
5. Buduczy Sojm // Jednašć. – 1921. – 29 traunia.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 60п. Воп. 3. Спр. 476.
7. Савіч, А. А. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гады): гістарыяграфія праблемы : манаграфія / А. А. Савіч ; навук. рэд. А. А. Каваленя. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2012. – 288 с.
8. НАРБ. – Ф. 60п. Воп. 3. Спр. 576.
9. НАРБ. – Ф. 60п. Воп. 3. Спр. 582.
10. НАРБ. – Ф. 60п. Воп. 3. Спр. 600.

11. НАРБ. – Ф. 60п. Воп. 3. Спр. 604.

12. Заходняя Беларусь. Зборнік грамадзкае мысьлі, навукі, літэратуры, мастацтва Зах. Беларусі. – Вільня : Друк. Вілен. вытвор. коопэратыву, 1924. – 156 с.

13. Заходняя Беларусь. – Менск : ДБВ, 1925. – 68 с.

14. Лучанін, М. Заходняя Беларусь пад панаваньнем Польшчы / М. Лучанін. – Менск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1926. – 56 с.

15. Западная Белоруссия : сб. ст. – Менск : Белорус. гос. изд-во, 1927. – Кн. 1. – 211 с.

16. Інтэрпэляцыі беларускіх паслоў у польскі сойм. 1922–1926 гг. : зб. дак. аб панскіх гвалтах, катаваньнях і зьдзеках над сялянамі і рабочымі Заходняй Беларусі. – Менск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1927. – 496 с.

17. Вансоўскі, Б. Куды Пілсудзкі вядзе Польшчу. Палітыка-эканамічны нарыс сучаснай Польшчы / Б. Вансоўскі, Г. Рудоміно. – Менск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1927. – 100 с.

18. Наступ капіталу ў Польшчы // Заходняя Беларусь : зборнік. – Менск : ДБВ, 1925. – С. 43–47.

19. Сучасная Польшча і Заходняя Беларусь // Заходняя Беларусь : зборнік. – Менск : ДБВ, 1925. – С. 3–30.

20. Смоліч, А. Сялянства Заходняй Беларусі (Яго сучаснае палажэньне) / А. Смоліч // Заходняя Беларусь : зборнік. – Менск : ДБВ, 1925. – С. 31–42.

21. Фришман, В. Промышленность Западной Белоруссии: стат.-экон. описание / В. Фришман. – Минск : Изд-во Белорус. акад. наук, 1934. – 133 с.

22. Гак, Л. Аграрная палітыка польскай буржуазіі ў Заходняй Беларусі / Л. Гак. – Менск : Дзярж. выд-ва Беларусі : Партмассэктар, 1933. – 95 с.

23. Бядуля, З. Партызанскі рух у Заходняй Беларусі / З. Бядуля // Заходняя Беларусь : зборнік. – Менск : ДБВ, 1925. – С. 48–68.

24. Белазеўскі, А. Заходняя Беларусь пад пятой польскіх акупантаў (За што Пілсудзкі разграміў Грамаду) / А. Белазеўскі. – Менск : Выд-ва ЦК МОПР БССР, 1928. – 45 с.

25. Беларуская сялянска-работніцкая грамада. – Менск : Дзярж. выд-ва, 1928. – 54 с.

26. Багданскі, Я. Аб клясавай барацьбе ў Заходняй Беларусі ў часы Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады / Я. Багданскі, Л. Бабровіч. – Менск : Беларус. акад. навук : Камісія Зах. Беларусі, 1932. – 67 с.

27. Западная Белоруссия на скамье подсудимых. Процесс Белорусской Крестьянско-Рабочей Громады. 23 февраля – 22 мая 1928 г. – Минск : Белорус. гос. изд-во, 1929. – 263 с.

28. Савіч, А. А. Фракцыйная барацьба ў КПЗБ: гістарыяграфія і перспектывы навуковага асэнсавання / А. А. Савіч // Весн. Гродз. дзярж. ун-та імя Янкі Купалы. Сер. 1, Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія. – 2017. – Т. 9, № 2. – С. 54–63.

29. Канчэўскі, І. З мінуўшчыны коопэрацыі ў Віленшчыне / І. Канчэўскі // Зах. Беларусь : зб. грамадзкае мысьлі, навукі, літэратуры, мастацтва Зах. Беларусі. – Вільня : Друк. Вілен. вытвор. коопэратыву, 1924. – С. 133–141.

30. Крывавыя пагромы на Зах. Беларусі і Зах. Украіне. Тысячы растрэляных рэвалюцыянераў. Перативарэнне фашысцкіх казэматаў у «фабрыкі сьмерці» // Зьвязда. – 1931. – 5 крас.

31. Цішка Гартны (Жылуновіч). Польскі фашызм залівае агнём і крывёю зах. беларускія і зах. украінскія прасторы. Астроўскі, Луцкевіч, Акінчыц і Ко – натхніцелі ўсіх жахаў і гвалтаў польскай апрычыны на Зах. Беларусі / Цішка Гартны (Жылуновіч) // Зьвязда. – 1931. – 9 крас.

32. Тарашкевіч, Б. Заходняя Беларусь – пляцдарм імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі / Б. Тарашкевіч. – Менск : Беларус. акад. навук : Каміс. па вывучэнні Заход. Беларусі, 1931. – 20 с.

33. Краіна шыбеніц і карных экспедыцый. Да 10-годзьдзя МОПР'у. – Менск : Друкарня Беларус. акад. навук, 1932. – 74 с.

34. Молотов, В. М. Доклад о внешней политике Правительства : стеногр. отчет / В. М. Молотов. – М. : Изд. Верхов. Совета СССР, 1939. – С. 7–24.

35. Гарбуноў, Ц. Год пад сцягам саветаў / Ц. Гарбуноў. – Мінск : Дзярж. выд-ва пры СНК. Рэд. паліт. літ., 1940. – 56 с.

36. Егоров, Г. Западная Белоруссия / Г. Егоров. – М. : Гос. изд-во полит. лит., 1939. – 40 с.

37. Пичета, В. Исторические судьбы Западной Украины и Западной Белоруссии / В. Пичета. – М. : Моск. рабочий, 1939. – 40 с.

38. Трайнин, И. Национальное и социальное освобождение Западной Украины и Западной Белоруссии / И. Трайнин. – М., 1939. – 80 с.

39. Лочмель, И. Ф. Очерк истории борьбы белорусского народа против польских панов / И. Ф. Лочмель. – М. : Воениздат, 1940. – 163 с.

40. Горбунов, Т. Воссоединение белорусского народа в едином советском социалистическом государстве / Т. Горбунов. – М. : Гос. изд-во полит. лит., 1948. – 232 с.

41. Каменская, Н. В. Уз'яднанне беларускага народа ў адзінай Беларускай Савецкай сацыялістычнай дзяржаве : стэнагр. публіч. лекцыі / Н. В. Каменская. – Мінск : Выд-ва Акад. навук БССР, 1948. – 28 с.

42. Перцаў, В. Барацьба працоўных Заходняй Беларусі за сваё вызваленне ў перыяд польскай акупацыі (1921–1939 гг.) / В. Перцаў // Бальшавік Беларусі. – 1947. – № 12. – С. 30–38.

43. Пономаренко, В. П. Католическая церковь Западной Белоруссии – орудие колониальной политики буржуазно-помещичьей Польши (1919–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук / В. П. Пономаренко ; Моск. гос. пед. ин-т им. В. И. Ленина. – М., 1955. – 15 с.

44. Царюк, А. В. Революционное освободительное движение в Западной Белоруссии (1919–1939 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук / А. В. Царюк ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1954. – 22 с.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 04.06.2018

***Savich A.A.*** **Policy Poland and the Situation in the West of Belarus in 1921–1939 in Reflected Domestic Historiography of the 1920s – the First Half of the 1950s**

*The conditioning accents and language presentation of the relevant issues of socio-political priorities of the Soviet regime is disclosed. The main thematic subjects, their political and ideological orientation, language dynamics and research focus on the core aspects of the topic are identified. Domestic historiographical concept of Polish policy in western Belarus is represented. The published works focused on the occupation, the aggressive essence of the Polish authorities, the creation of Poland strict regime of restrictions and persecution against the local non-Polish population, aimed at assimilation and polonization of Western Belarus, and had a high ideological and political and emotional level with a clear focus on the need for organization of the revolutionary struggle. Initial availability of objective information about the positive effects of western Belarusian reality gradually gave way to more simplified, biased and schematic presentation of events together with the general negative attitude to the Polish authorities.*